дапамогу нямецкіх акупацыйных войск і ўрада Германіі. Дзеля гэтага 25 красавіка 1918 г. на імя кайзера Вільгельма II была накіравана тэлеграма, у якой выказвалася падзяка за вызваленне ад чужога здзеку і гучала просьба аб абароне дзеля ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці [2, с. 124]. Многія дзеячы БНР тэлеграму палічылі памылкай. У беларускім руху пачаўся крызіс, які прывёў да расколу ў яго самай аўтарытэтнай партыі – БСГ і ўтварэння трох новых партый: сацыял-дэмакратычнай, сацыялістаў-рэвалюцыянераў і сацыялістаў-федэралістаў. Палітычны крызіс у беларускім нацыянальным руху да канца Першай сусветнай вайны так і не быў пераадолены. Капітуляцыя Германіі, скасаванне Брэсцкага міру ўрадам РСФСР, вывад нямецкіх войск з тэрыторыі Беларусі і аднаўленне савецкай улады стварылі ўмовы для фарміравання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.

Такім чынам, трэба прызнаць абвяшчэнне БНР ва ўмовах Першай сусветнай вайны спробай самавызначэння беларускага народа на аснове буржуазнай дзяржаўнасці, якая, аднак, не магла здзяйсняць свае функцыі ў поўнай меры, а накіраванасць яе палітыкі на саюз з Германіяй і разрыў сувязей з Расіяй не адпавядала памкненням беларускага народа. БНР уяўляла сабой структуру з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі, але ў поўным сэнсе дзяржавай не з’яўлялася [4, с. 58–60].

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.1: А – Беліца / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: М.В. Біч [і інш.] – Мінск: БелЭн, 1993. – 494 с.
2. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов / Ф. Турук. – М., 1921. – 144 с.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.6. Кн. 2: Усвея – Яшын; Дадатак / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) і [інш.] –Мінск: БелЭн, 2003. – 616 с.
4. Гісторыя Беларусі: Падруч. У 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2002 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі [і інш.]; Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 472 с.

**Голубева Людміла Леанідаўна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі, абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі (далей – БНР) і дзейнасць яе кіруючых органаў падштурхнулі бальшавіцкі ўрад у Маскве да фармальнага прызнання права беларускага народа на самавызначэнне і нацыянальную дзяржаўнасць. Пасля ліквідацыі войскамі Чырвонай Арміі БНР у снежні 1918 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне пра ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (далей – БССР) [8, с. 400–401]. У сувязі з гэтым Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей РСФСР прыняў дырэктыву «О практических мероприятиях образования БССР» [7, с. 148–149].

Рашэнне аб стварэнні БССР для Аблвыканкамзаха было даволі нечаканым, бо большасць яго членаў выступалі супраць утварэння

самастойнай рэспублікі на тэрыторыі Беларусі, аб чым яны неаднойчы заяўлялі кіраўніцтву РСФСР. Аднак, падпарадкоўваючыся партыйнай дысцыпліне, яны пачынаюць практычную рэалізацыю рашэння ЦК РКП(б) [3, с. 194; 1].

30 снежня 1918 г. у Смаленску праходзіла 6-ая Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя РКП(б), якая аб'явіла сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі. З'езд пастанавіў прызнаць неабходным абвяшчэнне БССР, акрэсліў яе тэрыторыю і зацвердзіў Часовы Рабоча-Сялянскі ўрад БССР.

1 студзеня 1919 г., абапіраючыся на рашэнні ЦК РКП(б) і рашэнні VI абласной партыйнай канферэнцыі, канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый, Усерасійскага з'езда беларускіх бежанцаў, рэзалюцыі мітынгаў і сходаў працоўных, Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад на чале з Д. Ф. Жылуновічам абвясціў БССР.

Юрыдычным канстытуцыйным актам, які абвясціў аб утварэнні БССР, быў Маніфест Часовага Рабоча-Сялянскага Савецкага Ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 г. (далей – Маніфест). Падрыхтаваў тэкст Маніфеста старшыня ўрада Д. Жылуновіч яшчэ ў Маскве. Маніфест падпісалі Старшыня Часовага Урада Д. Жылуновіч, сябры ўрада: А. Мяснікоў, С. Іваноў, А. Чарвякоў, І. Рэйнгольд.

Маніфест аб абвяшчэнні БССР акрэсліў статус новай дзяржавы. Рэспубліка выдзялялася з саставу РСФСР як самастойная дзяржаўная адзінка. Беларусь аб'яўлялася свабоднай, незалежнай рэспублікай, а яе народ – свабодным і паўнапраўным гаспадаром сваёй дзяржавы. Часовы рабоча-сялянскі ўрад называў сябе ўрадам «Беларускай Савецкай незалежнай рэспублікі». У Маніфесце ёсць і такі выраз «Вольная Савецкая беларуская рэспубліка» [2, с. 207–210]. Такія паняцці як «незалежная рэспубліка», «вольная рэспубліка», «свабодная рэспубліка» ў дакументах і публікацыях таго часу ўспрымаліся як суверэнная рэспубліка.

Аднак суверэннасць зусім не азначала разрыву палітычных, эканамічных, сацыяльных і партыйных сувязей, якія аб'ядналі Беларусь і Расію. Патрэбны былі новыя прававыя формы рэалізацыі адносін, што аказалася, як паказвае вопыт, справай выключна складанай.

Уся паўната ўлады на тэрыторыі рэспублікі павінна была пераходзіць у рукі Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Пастановы нямецкіх і іншых акупацыйных улад аб'яўляліся скасаванымі.

Часовы ўрад Беларусі не мог таксама не выказаць сваіх адносін да палітычных арганізацый, якія прэтэндавалі на дзяржаўнае прадстаўніцтва народа. Праціўнікі самавызначэння Беларусі на савецкай аснове ў духу таго часу разглядаліся часткай контррэвалюцыйных сіл ворагамі працоўных Беларусі і «ўсяго свету». Рада БНР аб'яўлялася па-за законам. Рэвалюцыйная помста ў адносінах да «буржуяў», памешчыкаў, іх слуг «за векавое прыгнечанне» ўзносілася на ўзровень рэвалюцыйнага абавязку. Усё гэта было не толькі вынікам лозунгавай запальчывасці, але і арыенцірам практычных дзеянняў. Адхіляліся якія-небудзь альтэрнатыўныя рашэнні нацыянальных праблем. Занадта вялікім быў напал класавага процістаяння, каб магчымы быў які-небудзь кампраміс у вырашэнні хаця б чыста культурных нацыянальных праблем [5; 9].

Маніфест змяшчаў прававыя ўстанаўленні, вельмі цікавыя для

разумення эканамічнага суверэнітэту ў сучасных умовах, хоць гэты тэрмін тады і не прымяняўся. Лясы, воды і нетры станавіліся ўласнасцю працоўнага народа Беларусі. Здабыткам народа аб'яўлялася таксама чыгунка, сродкі сувязі, фабрыкі, заводы, банкі. Такім чынам, рэспубліка станавілася ўласнікам усіх гэтых нацыяналізаваных прыродных і рукатворных багаццяў.

У Маніфесце быў пункт, які датычыўся перадачы Беларускай рэспублікай Расійскай Федэрацыі функцыі абароны Чырвонай Арміяй вялікіх заваёў сацыяльнай рэвалюцыі. Меліся на ўвазе перш за ўсё абарона і арганізацыя сумеснай ваеннай структуры. У Маніфесце Часовы ўрад заявіў таксама аб пашырэнні на БССР дэкрэтаў РСФСР «па забеспячэнню рабочага класа» [2]. У прыведзеных палажэннях з аднаго боку, мы бачым перадачу часткі сваіх суверэнных правоў органам РСФСР, а з другога – перайманне яе заканадаўчага вопыту. Гэтыя два моманты былі зачаткамі саюзных адносін паміж рэспублікамі.

Закранаўся і міжнародна-прававы аспект суверэннасці. Абвяшчэнне Беларусі «перад усім светам» незалежнай рэспублікай азначала заява аб з'яўленні на міжнароднай арэне новага суверэннага суб'екта міжнародных адносін, яго гатоўнасць прытрымліваццa агульнапрызнаных дэмакратычных норм міжнароднага права, дабівацца міжнародна-прававога прызнання.

Такім чынам, Маніфест, абвяшчаючы рэспубліку, у той жа час вызначыў суверэннасць дзяржаўнасці. Факт прыналежнасці Беларусі да былой царскай імперыі не накладае на БССР ніякіх абавязацельстваў.

Маніфест – першы канстытуцыйны акт Часовага ўрада Беларусі. Існуюць розныя кропкі гледжання наконт легітымнасці дадзенага акта. Ён заклаў асновы дзяржаўна-прававога будаўніцтва БССР; абвясціў БССР; замацаваў паўнату ўлады Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Аб'явіў несапраўднымі ўсе законы Рады і акупацыйных улад, увёў у дзеянне на ўсёй тэрыторыі БССР дэкрэты РСФСР.

У склад Часовага Рабоча-Сялянскага Ўрада БССР увайшлі кіруючыя работнікі Паўночна-Заходняга абкама партыі, Аблвыканкамзаха, Белнацкама (Старшыня Д. Ф. Жылуновіч (Цішка Гартны) і члены ўрада – А. Мяснікоў, С. Іваноў, А. Чарвякоў, І. Рэйнгольд, О. Дыло, В. Фальскі, Ф. Шантыр і інш. [6, с. 149–151.].

5 студзеня 1919 г. Часовы Рабоча-Сялянскі ўрад Беларусі пераехаў са Смаленска ў Мінск і прыступіў да вельмі складанай працы па стварэнні дзяржаўнага апарата рэспублікі, аднаўленні эканомікі і наладжванні мірнага жыцця грамадства. 7 студзеня Урад выдаў пастановы № 1 і № 2, у якіх юрыдычна замацоўваўся пераход улады ў губернях Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай ад Аблвыкамзаха і Мінскага губрэўкама да Часовага ўрада і яго камісарыятаў. Адначасова абвяшчалася, што ўсе раней выдадзеныя ўрадам РСФСР дырэктывы, пастановы і распараджэнні, якія былі ажыццёўлены мясцовымі органамі Беларусі, застаюцца ў поўнай сіле [2, с. 211–212].

Аднак мірная праца была хутка парушана захопніцкімі дзеяннямі Польшчы з мэтаю аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Першачарговай задачай кіруючых колаў Польшчы з'яўлялася далучэнне Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў.

Улічваючы прэтэнзіі Польшчы на заходнюю частку Беларусі і Літву, ЦК РКП(б) па ініцыятыве У. І. Леніна 16 студзеня 1919 г. прыняў рашэнне

перадаць у склад РСФСР тры губерні: Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую, а Мінскай і Гродзенскай губерням аб’яднацца з Літоўскай ССР у адно дзяржаўнае ўтварэнне – Літоўска-Беларускую ССР (далей – ЛітБел ССР). Галоўным матывам такога рашэння было стварэнне ЛітБел ССР, якая павінна была стаць буферам паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, Буржуазным Захадам.

У мэтах больш хуткага ажыццяўлення гэтых рашэнняў у Беларусь быў накіраваны ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) А. Іофе. 16 студзеня 1919 г. адбыўся пленум ЦК РКП(б), на якім вырашалася пытанне аб выключэнні са складу тэрыторыі Беларускай ССР некалькіх губерняў.

Афіцыйную пазіцыю Маскоўскага кіраўніцтва па гэтым пытанні выклаў прадстаўнік ЦК РКП(б) А. Іофе на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 22 студзеня 1919 г.: каб пазбегнуць уплыву «імперыялізму на Расію, ЦК вырашыў утварыць паміж ім і намі шэраг рэспублік-буфераў… На аснове гэтых меркаванняў ЦК пастанавіў утварыць Літоўскую і Беларускую рэспубліку» [4, с. 95].

Члены ЦБ КП(б)Б згадзіліся з пастановай ЦК РКП(б) аб адарванні ад БССР трох губерняў. Супраць выказаліся толькі паасобныя члены ЦБ Кампартыі Беларусі. Прадстаўнікі Часовага ўрада БССР Д. Жылуновіч, А. Чарвякоў, А. Дыла, В. Фальскі, Ф. Шантыр, А. Квачанюк, І. Пузыроў накіравалі пісьмо прадстаўніку ЦК РКП(б) А. Іофе, а копіі пісьма – У. Леніну, Я. Свярдлову і І. Сталіну. Вынікам гэтага пісьма было толькі тое, што пры камплектаванні новага ўрада БССР у пачатку лютага 1919 г. усе яго аўтары, за выключэннем І. Пузырова, не былі выбраны ў склад вялікага прэзідыума ЦВК БССР, які выконваў функцыі ўрада.

Цікавы той факт, што для перадачы ў ЦК РКП(б) просьбы Цэнтральнага Бюро РКП(б) Беларусі аб пераглядзе пастановы пра ўключэнне трох беларускіх губерняў у склад РСФСР у Маскву былі накіраваны Р. Пікель і І. Рэйнгольд. Яны пазнаёмілі У. Леніна з меркаваннямі ЦБ Кампартыі Беларусі. У. Ленін адзначыў, што рэспубліка буферная і патрэбна настолькі, наколькі мяжуецца з іншымі краінамі. Так як Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні не мяжуюць з іншымі краінамі, то іх можна выключыць [9]. Такім чынам, стварэннем ЛітБел ССР як бы здымалася пытанне аб правамернасці далучэння ўсходніх этнічных беларускіх зямель да РСФСР. Як вядома, БССР праз месяц пасля абвяшчэння незалежнасці і ўтварэння беларускай дзяржаўнасці стала часткай аб’яднанай дзяржавы – ЛітБел ССР.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319 с.
2. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзен) / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад агульн. рэд. праф. А.Ф. Вішнеўскага. – Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.
3. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: Амалфея, 2007. – 400 с.
4. Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў у 10 т. / рэдкал. І. Антановіч (гал рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – Т. 1 : 1917 – 1922. – 398 с.
5. Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 238 с.
6. Кузнецов, И.Н. История государства и права Беларуси / И.Н. Кузнецов, В.А.

Шелкопляс. – Минск: Тессей, 2004. – 318 с.
7. Маргунский, С.П. Создание и упрочение белорусской государственности / С.П. Маргунский. – Минск: Изд-во АН БССР, 1958. – 258 с.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993 – 2001.
9. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. Ч. 2 / Я.А. Юхо. – Мінск: РІВШ БДУ, 2003. – 275 с.

**Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## АНТЫРЭЛІГІЙНАЯ КАМПАНІЯ 1929–1930-х гг. У БССР

Пачатак антырэлігійнай кампаніі, распачатай Сталіным у другой палове 1927 г. і падрыхтаваўшай новую хвалю антырэлігійнага наступу ў 1929 г., амаль не адбіўся на змесце і маштабах работы па барацьбе з рэлігіяй у Савецкай Беларусі. Адыход ад «рэлігійнага НЭПа» адбываўся ў шматканфесійнай рэспубліцы павольна і непаслядоўна. У прынятай 17 ліпеня 1928 г. сакратарыятам ЦК КП(б)Б рэзалюцыі «Аб становішчы і задачах антырэлігійнай работы ў БССР» канстатавалася паслабленне антырэлігійнай работы ў шэрагу акруг, у т. л. у Мінскай і Віцебскай. Сярод нацыянальных меншасцей і сектантаў яна наогул не праводзілася. Беларускі саюз бязбожнікаў вёў вартае жалю існаванне, налічваючы ў сваіх шэрагах менш за 8 тыс. чалавек, пераважна служачых і вучняў. Актыў бязбожнікаў ня быў узяты на ўлік і з ім не праводзілася ніякай працы [18, арк. 15–16].

Нягледзячы на тое, што ў распарадчай частцы гэтага дакумента пералічваліся захады па пастаноўцы шырокай антырэлігійнай працы, пералому ў ёй ў другой палове 1928 г. дасягнута не было. Калі ў канцы студзеня 1929 г. у Мінску адбылося абмеркаванне цыркулярнага ліста ЦК УсеКП(б) «Аб мерах па ўзмацненню антырэлігійнай работы», беларускае партыйнае кіраўніцтва прызнала, што яго дзейнасць у дадзеным пытанні не адпавядала ўзроўню патрабаванняў, што прад'яўляліся вышэйшым партыйным кіраўніцтвам. Напрыклад, у той час толькі 6% грамадзянскіх абрадаў, якія здзяйсняліся ў рэспубліцы не пацвярджаліся рэлігійнымі дзеяннямі. У паловы камуністаў, працаваўшых на прадпрыемствах і ўстановах ВСНГ БССР меліся дома абразы [27, с. 73–82].

Сітуацыя змянілася ўжо ў наступным месяцы, пасля таго, як першы сакратар ЦК КП(б)Б Я. Б. Гамарнік у палітычным дакладзе XII з'езду КП(б)Б прысвяціў пытанню антырэлігійнай прапаганды асобную частку. У ім утрымлівалася шмат крытыкі на адрас адказных за атэістычнае выхаванне («я, напрыклад, не мог атрымаць даведкі, колькі па Беларусі чальцоў «Бязбожніка»), а таксама агрэсіўных выказванняў у адрас служыцеляў культу і вернікаў («царкоўнік лезе ў школу і на фабрыку, на Добрушы царкоўнікі адчуваюць сябе часам прамымі гаспадарамі, забаранялі співаць камсамольскія песні», «царкоўнікі спрабуюць уплываць і на бядноту і на серадняка, па Мінскай акрузе ў царкоўныя рады ўваходзяць 69% сераднякоў, 17% беднякоў і 10% кулакоў». Заканчваўся раздзел заклікам Я. Б. Гамарніка пачаць супраць рэлігіі рашучы наступ, уцягваючы ў гэтую барацьбу шырокія шэрагі працоўных. Першы сакратар асабліва падкрэсліў, што «гэта класавая